# Алімпіяда па беларускай мове
# 10 клас

1. **Падкрэсліце словы, у якіх літары е, ё, я абазначаюць галосны гук і мяккасць папярэдняга зычнага**
Вясёлка, Янка, пад’ём, копія, з’ездзіць, жыццё, сняданак, шчаўё, маянэз, клёцкі, ежа, аб’ехаць, бліны, Праметэй.

2. **Запішыце па-беларуску наступныя назвы населеных пунктаў:**
Ганцевичи, Марьина Горка, Телеханы, Дубровно, Чечерск, Заславль, Верхнедвинск, Красносельский, Бегомль, Лельчицы.

3. **Вылучыце карані ў наступных словах:**
зборшчык, пабыўка, перайсці, расстаўляць, сурвэтка, увага, хісткі, прад’яўляць.

4. **Праспрагайце дзеясловы: абысці, браць, есці, жаць.**

5. **Праз сінонімы або апісальна патлумачце значэнне наступных слоў**
Алегорыя - …; дойлід - …; фрагмент - …, кашнэ - …; іронія - …; рэзюмэ - …; атрамант - …; батлейка - …; вершнік - …; зёлкі - …; інсургент - …; кампраміс - …; вікторыя - …

6. **Узнавіце фразеалагізмы, дапісаўшы патрэбныя займеннікі**
а) Зарубіць___________на носе.
б) На__________капыл (перарабіць)
в) На __________лады.
г) Не з_________рукамі.
д) Паспытаць________хлеба.
е) Чуць на_______вушы.
ж) Як на________ліха.
з) Скінуць з_________ветхага Адама.

7. **Падкрэсліце вылучаныя словы як члены сказа і запішыце ў пустыя клеткі табліцы, як называюцца гэтыя члены сказа.**

| | |
|---|---|
| 1. Што гэта было? | 1 |
| 2. Хлопцаў папрасілі перайсці ў другі пакой. | 2 |
| 3. Вось бы і мне стаць знакамітым! | 3 |
| 4. Андрэй урачыста даў слова працаваць над сабой, быць сябрам у простым сэнсе слова. | 4 |

| | |
|---|---|
| 5. Быць самім сабой, адшукваць у глыбіні саёй самога сябе – вось жыццёвая задача чалавека. | 5 |

8. **Запішыце, да якіх асоб можна звярнуцца прапанаванымі словамі:**
Кума –
Свацця –
1) 2)

9. **Устаўце ў прыказкі патрэбныя словы, якія з'яўляюцца назвамі частак маўленчага апарату. Растлумачце сэнс**
1. Чужы кусок дзярэ…
2. … век на балоце скача і гразня, ды яшчэ ў Кіеў у карчму давядзе.
3. У каго згуба, у таго граху поўна…
4. Не вер… - палажы на…
5. Сказанага слова да … не вернеш.

10. **Прыгадайце 5 назоўнікаў на –аў (-оў-, -ёў-), якія абазначаюць прозвішчы вядомых беларускіх пісьменнікаў, і запішыце іх у форме творнага склону.**

# Адказы

1. Вясёлка, жыццё, сняданак, клёцкі, бліны, Праметэй.
2. Ганцавічы, Мар'іна Горка, Целяханы, Дуброўна, Чачэрск, Заслаўе, Верхнядзвінск, Краснасельскі, Бягомль, Лельчыцы.
3. З-бор-шчык, па-бы-ўка, пера-йс-ці, рас-стаўл-яць, сурвэт-ка, у-ваг-а, хіст-кі, прад'-яўл-яць.
4. 

| | | | |
|---|---|---|---|
| абыду | бяру | ем | жну |
| абыдзеш | бярэш | ясі | жнеш |
| абыдзе | бярэ | есць | жне |
| абыдзем | бяром | ядзім | жнём |
| абыдзеце | бераце | ясце | жняце |
| абыдуць | бяруць | ядуць | жнуць |

5. Алегорыя – іншасказанне, дойлід – архітэктар, фрагмент – урывак, кашнэ – шалік, іронія – насмешка, рэзюмэ – вывад, атрамант – чарніла, батлейка – лялечны тэатр, вершнік – коннік, зёлкі – лекавыя травы, інсургент – паўстанец, кампраміс – пагадненне, вікторыя – перамога.
6. а) сабе
   б) свой
   в) усе
   г) тваімі
   д) свайго
   е) свае
   ж) тое
   з) сябе
7. 1) выказнік
   2) дапаўненне
   3) састаўны іменны выказнік
   4) азначэнне
   5) састаўны іменны дзейнік

8. Кума – зварот бацькоў хрэсніка або хрэсніцы, а таксама хроснага бацькі да хроснай маці.

Сваццця – 1) зварот бацькоў жонкі (мужа) да маці мужа (жонкі)
2) зварот да жанчыны, якая сватала нявесту жаніху ці жаніха нявесце.

9. 1) – раток; 2) – язык; 3) – губа; 4) – губе, зуб; 5) – губы

10. Янка Сіпакоў – Янкам Сіпаковым і інш.